
Незалежны інфаматэрыял: Жодзіна, Смалявічы, Лагойск

Прэс- панарама

№ 07.2008



Інфарэзананс на выбарчыя падзеі

Пачатак выбарчага працэсу на выбарчых акругах №66 і №67 (Жодзіна, Смалявічы, Лагойск) ... - навіны, факты, камэнтары, высновы і заявы: грамадзтва, выбарчае права, калектыўнае супрацьстаянньне ЗА ...





АЛЯКСЕЙ ЛАПІЦКІ

1

ПРАВА НА ВЫБАР – АСНОЎНАЕ ДЛЯ ПЕРАМЕНАЎ У ГРАМАДЗТВЕ!

МЫ – БУДЗЕМ ЖЫЦЬ У СВАБОДЗЕ!

ПРАВА НА ВЫБАР – АСНОЎНАЕ ДЛЯ ПЕРАМЕНАЎ У ГРАМАДЗТВЕ!








Кіраўніца ЦВК – №13.



12

ÇÀ ÑÂÀÁÎÄÍÛ
ÂÛÁÀÐ



“Мы - Ліцьвіны”
& Licviny-INFA


ÂÛÁÀÐ×ÛßÐÝÁË22

АФІЦЫЙНЫ ПЕРАДВЫБАРЧЫ ФОН – «РУЖОВЫ ТУМАН» РЫТОРЫКІ, АЛБО ВАРТЫ ЎВАГІ КРОК НАСУСТРАЧ СТАНОЎЧЫХ ПЕРАМЕНАЎ …!?

ЯК ПРЫГОЖА ПАЧЫНАЛАСЯ КАЗКА ПРА … НОВЫЯ – САПРАЎДЫ ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ



Нехта паверыў, а нехта – проста адкрыў вочы і ўбачыў … Улада, як звычайна – гуляе па буйному, але – краплёнай картаю «паўпраўды ды праўды з шматкропьем …»



Перад абвяшчэньнем выбараў па АНТ (афіцыйных каналах тэлебачаньня) прайшла сэрыя фільмаў, якія стваралі атмасфэру страху і недаверу непасрэдна да праваабаронцаў, грамадзкай супольнасьці й няўрадавых арганізацыяў, незалежнага назіраньня навогул. Праваабаронцаў і незалежных назіральнікаў усе афіцыйныя СМІ, як па дамове, пачалі прадстаўляць як "пасобнікаў і наймітаў" "варожага захаду", якія нясуць небясьпеку грамадзкаму міру і стабільнасьці…

А ў дзень абвяшчэньня выбараў той жа тэлеканал прадстаўляў "трыбуну" для выказваньняў Прэзыдэнта РБ Лукашэнкі А.Р., для заявы кіраўніка праўрадавага палітычна-ідэалягічнага ўтварэньня "Белая Русь" (міністра адукацыі сп. Радзькова), прамова якога насіла відавочна рэклямны передвыбарчы характар. Яна, фактычна, мела на мэце публічна публічна абвясьціць пра тое, што "Белая Русь" пойдзе на выбары шырокім фронтам (і ў камісіі, і - вылучаючы кандыдатаў у дэпутаты ПП НС РБ …) і толькі пасьля перамогі канчаткова будзе аформлена ў якасьці партыі (рэд. – "партыі ўлады").

Наступным, адразу ж, у кантэксьце выбараў, паказвалі выступ намесьніка міністра МУС РБ Канапацкага, які на фоне сцэнаў вучэньняў спэцназу (з шчытамі і дубінкамі супраць грамадзянаў у штацкім) абвяшчаў пра тое, што сілавікі рыхтуюцца і яны не дапусьцяць масавых беспарадкаў у краіне (потым пытаюць, а хто ў грамадзтве псыхоз разпашырае? – узровень самазабойстваў у Беларусі сёньня і без таго самы высокі ў сьвеце …).

А потым у правільных СМІ – гучалі выказваньні Прэзыдэнта РБ пра тое, што выбары будуць праведзены на самым вышэйшым дэмакратычным узроўні. Яны, на гэты раз, будуць паказальна адкрытымі й празрыстымі ў параўнаньні зь іншымі краінамі (трэба разумець, заходнімі - ?).

Пры гэтым, адразу старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына падмацавала дадзены аптымізм прыкладам таго, што адпаведна з Дэкрэтам (які забясьпечвае шырокі ўдзел палітычных партыяў у выбарах) кожная зь іх атрымае магчымасьць вылучыць 1-го прадстаўніка ў ЦВК з правам дарадчага голасу.

Як звычайна, шматлікія эмацыйныя заявы і паўторы гэткага "непадробнага афіцыйнага аптымізму" па ўсіх тэлеканалах і ў афіцыйнай прэсе стварылі ўражаньне (для звычайнага гледача – раўназначнае неаспрэчнай ісьціне), што партыям і апанэнтам улады на будучых выбарах у Парлямэнт РБ дазволена мець ледзь не па аднаму паўнавартаснаму супрацоўніку ў кожнай выбарчай камісіі (!). І гэта былоб натуральным выйсьцем з зачараванага кола шматлікіх злоўжываньняў уладаю і парушэньняў выбарчага правам ўчасе выбарчых працэдураў. Камісіі ў нармальных умовах і павінны складацца з прадстаўнікоў розных палітычных партыяў ці апанэнтаў, якія ідуць на выбары. Тады, ёсьць гарантыя, што выбары будуць сапраўды выбарамі. А вынікам будзе лічыцца не тое, "як падлічуць", а тое – як прагаласуюць.

Аднак, пры азнаямленьні з самім, гэтак "разрэклямаваным на публіку" дакумэнтам, аказалася, што ў ім няма нічога новага. Дэкрэт №13 ад 24 ліпеня 2008г. – літара ў літару, цалкам дублюе Указ №7 ад 2004 году. І не больш за гэта. Дык што ж зьмянілася ў лепшы бок, каб крычаць на ўвесь сьвет – дэмакратызацыя выбараў, перамены …! Не хвалюйцеся – нічога не зьмянілася … РУЖОВЫ ТУМАН АФІЦЫЙНЫХ ПРАМОВАЎ НЯ МАЕ НІЧОГА АГУЛЬНАГА З ПРАКТЫКАЙ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ВЫБАРЧАЕ КАМПАНІІ.

Падобныя "бурбалкі" пускаюцца ў "акварыюме БТ" для тых, хто прызвычаіўся радавацца кожнаму слову "правадыра", сьлепа верыць у тое, што хацеў бы пачуць, то бок … – для даверлівых і наіўных выбарнікаў, міжнародных назіральнікаў, сусьветнай супольнасьці й Эўропы. З апошняй – канешне, даўна насьпеў час мірыцца. Але, пры гэтым, для ўлады, ідэальным было б яшчэ й атрымаць заплянаваны

ЗА СВАБОДНЫ ВЫБАР!
БЕЗ ВЫБАРУ –
НЯ МОЖА БЫЦЬ
ПЕРАМЕНАЎ!



на выбарах, як звычайна – “элегантны вынік”, які можа забясьпечыць толькі добра спрактыкаваная й кіруемая сыстэма “выбарчае вэртыкалі”.

При гэтым, элегантнасьць забясьпечваюць шматлікія “амаль праўдзівыя” публічныя “рэверансы”, наяўнасьць “правільных камісыяў” і выбарчая актыўнасьць ... Усё астатняе – справа, як кажуць, тэхнікі.

Вяртаючыся да ледзь не “сэнсацыйна дэмакратычнага” Дэкрэту №13, як і 4 гады назад, прадстаўнікам партыяў у Цэнтральнай выбарчай камісыі ў ім – прадугледжаны чыста “дэкаратыўны статус”. Яны ня маюць права ні ўдзельнічаць у праверках па зваротах і скаргах суб’ектаў выбараў, ні ў абмеркаваньнях ці галасаваньнях на паседжаньнях …, таму й ня маюць магчымасьці ўплываць на прымаемыя ЦВК рашэньні.

Так пачыналася новая “казка” пра свабодныя выбары ў Беларусі. Казачнікаў трэба было –толькі слухаць. Слухаць з заплюшчанымі вачыма. Бо



рэальнасьць – адразу абдавала “халодным душам”. І ілюзыя адразу зьнікала. А заставалася сапраўднасьць – шэрая, штодзённая і …, як дубец спэцназаўца ля “Плошчы Перамогі” – жэлезабэтонна правільна-лінейная …

Уся гэткая бутафорыя зь “пераменамі” яшчэ нагадвае прымітыўнае жаданьне аднім махам пераўтварыць постсавецкі шэры горадзкі “пэйзаж” у сьвточна-эўрапейскі шляхам простай пафарбоўкі разьбітых бэтонных бардзюраў белай вапнаю ... Варта толькі глянуць на падобную “прыгажосьць”... – і ўсё становіцца на сваё месца. І сьвята – як не бывала ...

А ааб зьнік “ружовы туман” – дастаткова “паветра” вольнага слова й сьвежае думкі. А яны – толькі там, дзе ёсьць імкненьне да праўды і да свабоды.

ДЫК ЦІ БУДУЦЬ ВЫБАРЫ ВЫБАРАМІ!? А ЯК ВЫ ДУМАЕЦЕ?

АД ПАПУЛІЗМУ ЗАЯВАЎ – ДА ПРАКТЫКІ.



ФАКТЫ І АРГУМЭНТЫ …

Жодзіна

Першыя кантакты з супрацоўнікамі мясцовае ўлады, адказнымі за фармаваньне выбарчых камісыяў паказалі, што яны парушаючы асноўныя прынцыпы адкрытасьці й празрыстасьці выбарнага працэсу робяць яго максымальна закрытым ужо с самых першых крокаў і выкарыстоўваюць для гэтага ў выглядзе аховы праваахоўныя сілавыя структуры, функцыя якіх зусім у іншым.

Так у Жодзіне, адказны за выбарчы працэс супрацоўнік выканкаму (кіраўніца ідэалягічнага адзьдзелу Аксана Грышкевіч) адразу ўжыла мэтад запалохваньня, выклікала па тэлефоне міліцыянта для выдаленьня з памяшканьня грамадзяніна, які прыйшоў да яе задаць некалькі актуальных для вылучэньня ў склад Акруговай выбарчай камісыі пытаньняў … Яна проста адмовілася адказваць канкрэтна на пастаўленае пытаньне й прапанавала праваабаронцу Аляксею Лапіцкаму пачытаць фармулёўку з Выбарчага Кодэксу РБ, якая не ўтрымлівае адказу. Напрыканцы канфлікту, на нстойлівы запыт супрацоўніца выканкаму, як бы спахапіўшысь адказала на пытаньне …

А адразу пасьля гэтага, міліцыянт, што суправаджаў “парушальніка спакою” выканкамаўскіх кабінэтаў, пасьля высьвятленьня абставінаў “інцыдэнту”, сам прапанаваў наведвальніку зрабіць адпаведны запіс у “Кнігу заўвагаўі прапановаў”, што і было зроблена 30.06.2008г.

Па гэтым запісе прайшла перапіска ўчасе якой, адказы з Жодзінскага выканкаму проста ўразілі сваёй “непасрэднасьцю”.

Сямашка У.М., а за ім і Грышчанка В.І. альбо проста безпрадметна цытавалі нейкі артыкул ВК РБ (арт. 34 ВК РБ, Сямашка У.М.), альбо рабілі доўгі пералік артыкулаў і праўных дакумэнтаў, у поўнай адпаведнасьці зь якімі, быццам бы, дзейнічала супрацоўніца выканкаму … (!?) і раілі – заяўніку “у далейшым для пазьбяганьня канфліктных сытуацыяў у мэтах атрыманьня поўнай і аб’ектыўнай інфармацыі больш акрэслена й пісьменна фармуляваць пастаўленыя пытаньні” (старшыня выканкаму, Грышчанка В.І.).

Аднак, пасьля гэтых адпісак, як сьведчыць Аляксей Лапіцкі, паводзіны начальніцы адзьдзелу кадраў Жодзінскага выканкаму кардынальна зьмянілася. Таварыша начальніцу з выканкаму, стала проста цяжка пазнаць – яна пачала сапраўды паводзіць сябе надзвычай безканфліктна – натуральна ўсьміхалася, паводзіла сябе абыходліва й тактоўна … Так і павінна быць заўсёды … Гэта абавязак чыноўніка ўва ўзаемадачыненьнях з грамадзянамі. Яна, нават, урэшце пачала адказваць на пастаўленыя пытаньні, якія тычацца выбарчага працэсу … (!?)

Цікава, але афіцыйныя адказы, якія скіроўваліся перад гэтым заяўніку зусім не адлюстроўвалі таго, што адбывалася ў кабінэтах выканкаму падчас разгляду пытаньняў, пастаўленых праваабронцам у пісьмовых заўвагах.

Выснова адна – нам усім трэба вучыцца абараняцца ад нахабства чыноўніка, у літаральным сэнсе – ставіць яго на месца, вучыцца абараняць свае грамадзянскія правы й свабоды з прынцыповых пазыцыяў, фіксуючы парушэньні запісамі ў Кнізе заўвагаў і прапановаў, пісьмовымі зваротамі, ствараючы тым самым аснову для вырашэньня канфліктных сытуацыяў і праблемаў на падставе нормаў права ...

Кожны здольны спыніць хвалю хамскага бюракратызму й агрэсыўнасьці, бо чыноўнік павінен дзейнічаць строга па законе і выключна ў межах прадпісаных яму паўнамоцтваў. Пры гэтым, нам усім



Licviny-INFA



трэба ўразумець і дакладна ведаць, што чыноўнік любога рангу – функцыянэр альбо звычайны службовец той установы ўлады, якая працуе для забясьпячэньня гарантыяў і рэалізацыі правоў і свабод грамадзянаў.

А кожны супрацоўнік міліцыі, заўважце – праваахоўнай установы – ёсьць не прыватным целаахоўнікам прадстаўніка ўлады, не карнікам нейкага “ўдарнага фармаваньня”, але вартавым правапарадку, якому грамадзтва й дзяржава дaручылі ахоўваць усё тыя ж Канстытуцыйныя правы й свабоды звычайных грамадзнянаў, іхную маёмасьць, жыцьцё й чалавечую годнасьць.

Ён – не “наймiт” асобна ўзятага, нават, самага важнага і “заўсёды правільнага” чыноўніка ці нейкай “прыўладна-намэнклятурнай групы”, не ўзброены статусам недатыкальнасьці “жаўнер кіруючага рэжыму”, ягонага свавольства і ўсёдазволенасьці, але – ахоўнік закону і правапарадку.

ВЫПАДКОВАСЬЦЬ АЛЬБО ЗАКАНАМЕРНАСЬЦЬ?

Сабраныя 108 подпісаў і своечасовы зварот у органы, ўтвараючыя Акруговыя выбарчыя камісіі ў Беларусі, не дапамаглі праваабронцу й сябру сойму Партыі БНФ у Жодзіне, Аляксею Лапіцкаму трапіць у склад Жодзінскай АВК №66 па выбарам у Палату Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу РБ.

Заяўніку, нават не дазволілі прысутнічаць на адпаведным паседжаньні Менаблвыканкаму 14.07.2008г. у Менску, куды ён спэцыяльна прыехаў пасьля ўзгадненьня часу і месца правая здзеньня паседжаньня з начальнікам Галоўнага ўпраўленьня арганізацыйна-кадравай працы Амельянчуком М.М. (былым першым намесьнікам па ідэалёгіі старшыні Жодзінскага выканкаму).

Разам з Аляксеем Лапіцкім на паседжаньне не дапусьцілі і незалежнага назіральніка ад Беларускага Гэльсынскага Камітэту (БГК), делегаванага на гэту важную выбарчую працэдуру …

У адказах на пратэст і запісы, зробленыя ў Кнізе заўвагаў і прапановаў ад Аляксея Лапіцкага як прэтындэнта і Леаніда Мархоткі (назіральнік ад БГК), усё той жа Амельянчук М.М. патлумачыў недопуск дадзеных асобаў на паседжаньне тым, што адпаведна Рэглямэнту аблвыканкаму, на яго дапускаюцца толькі тыя, хто быў у адмысловых сьпісах запрошаных. Таму для гэтага – патрабавалася “папярэдняе ўзгадненьне з аблвыканкамам”.

Аднак, дадзенае ўзгадненьне перад паседжаньнем адбывалася. Менавіта на ім Аляксей Лапіцкі па тэлефоне атрымаў ад Амельянчука М.М. дакладны час пачатку паседжаньня 14.07.2008 года ў 9-30 у будынку Менскага аблвыканкаму. А што “папярэдняе ўзгадненьне” павінна быць пісьмовым зваротам – нідзе не пазначана. Таму, тлумачэньне недопуску на паседжаньне – адсутнасьць загадзя пададзенага пісьмовага запыту – можна разглядаць як уход ад наўпростага адказу на канкрэтнае пытаньне.

А рэальная матывацыя – зусім у іншым. Пытаньне допуску на паседжаньне нгезалежных прадстаўнікоў назіраньня выносілася на разгляд Менаблвыканкаму 14.07.2008г. Так, да чакаючых пропуску на ўваходзе назіральнікаў (іх не прапускала ахова) выйшаў намесьнік Амельянчука М.М. і паведаміў ім аб недопуску на паседжаньне. Нагоды адмовы – не тлумачыліся.

Адзначым, што любое тлумачэньне недопуску, выглядае несур’ёзным і нагадвае звычайны стыль постсавецкай беларускай намэнклятуры, якая разумее выкананьне закону выключна з фармальных пазыцыяў – галоўнае недапусьціць, абмежаваць альбо даць своечасовы пісьмовы адказ на запыт ... А што напісана ў гэтым адказе – абсалютна не істотна ... Адказнасьці за звычайныя адпіскі – нават, на даляглядзе – не прадбачыцца.

Так, закрываючыся ад “вачэй грамадзтва” улада майструе сваю “правільную законнасьць” і падобную ёй “папяровую справядлівасьць”, стварае перадумовы “бязконцай стабільнасьці” ва ўмовах “аўтарытарна кіруемай дэмакратыі”. Разьлік на тое, што тут заўсёды будзе кіраваць“правільны клан”, узброены “правільнай ідэалёгіяй”. Але дзе ж тады – “самы дэмакратычны ў сьвеце”, “адкрыты й празрысты” выбарчы працэс?! Дзе свабода выбару?!

Для ведама – на адзначаным супольным паседжаньні ў Аблвыканкаме кандыдатуру Аляксея Лапіцкага, якога не дапусьцілі да ўдзелу ў паседжаньні, проста не разглядалі. То бок, зацьвярджаліся загадзя адфільтраваныя й падабраныя выканкамамі сьпісы будучых АВК ...

Можна толькі канстатаваць, што такім практычным крокам у самым пачатку выбарчага працэсу ўлады цалкам абвергли ўласныя гучныя заявы аб тым, што выбары ў Беларускі Парлямэнт восеньню 2008 года, на гэты раз, як ніколі раней (!?), будуць дэмакратычнымі, паказальна адкрытымі й празрыстымі (у тым ліку – для назіраньня).

Дык выпадковым альбо заканаерным ёсьць дадзенае рашэньне!? Думаецца, што большасьць – безумоўна, ведае адказ на дадзенае пытаньне. У такім выпадку, можа ня варта цешыць сябе ілюзыямі й працягваць сьлепа верыць у падобныя “казкі”, а сказаць сваё важкае слова СУПРАЦЬ ПАДМАНУ і ЗА СВАБОДУ ...

Незалежны выпуск інфапраспэкту - улёткі, Жодзінскі рэгіён
(Âû äàäçåòöàÿ ¶ ÏÔÛÿöû âà“ÇÀ ÑÂÀÁÎ ÄÍ Û ÂÛÁÀÐ”, Licviny-INFA)
Без рэдакцыі ...
Ініцыятыва СВАБОДЫ
Наклад 500 асобнікаў.
АЛЕСЬ ВОЛЬНЫ ...
ÇÀ ÑÂÀÁÎÄÍÛ ÂÛÁÀÐ
Пры передруку спасылка на інфа-матэрыял абавязковая ...